***Уладзіслаў Цітоў***

## УПЛЫЎ АСОБЫ ЗНАХАРА, ЛЕКАРА, ВАРАЖБІТА НА БЫТ І КУЛЬТУРУ ВЯСКОЎЦАЎ

Насельніцтва Вілейскага раёна па дадзеных на 1 студзеня 2007 года 56 тысяч чалавек, з якіх 51 % гараджане і 49 % вяскоўцы [3,384]. Па нацыянальным складзе ў большасці беларусы – 92,2 %, рускіх – 5,9 %, украінцаў – 0,9 %, палякаў – 0,5 % і іншых нацыянальнасцяў – 0,5 %[3,384]. Па веравызнанні большасць насельніцтва праваслаўныя (яны складаюць прыкладна каля 85 % ад усіх веруючых), католікаў каля 12 % і 3 % пратэстантаў і людзей іншых веравызнанняў. Самымі актыўнымі ў сваёй дзейнасці з’яўляюцца пратэстанты, бо нягледзячы на малы працэнт вернікаў, пратэстантскіх суполак у раёне зарэгістравана больш за 10. Затым па актыўнасці сваёй дзейнасці сярод насельніцтва ідуць католікі. На Вілейшчыне зарэгістравана 8 рымска-каталіцкіх прыходаў, з якіх адзін у Вілейцы, астатнія вясковыя. Праваслаўныя вернікі аб’ядноўваюцца ўсяго ў 25 прыходаў, 3 з якіх знаходзяцца ў горадзе і 22 у вёсках. Няверуючымі ці перакананымі атэістамі лічаць сябе вельмі нямногія жыхары раёна. Іх колькасць складае прыкладна 2 % ад усяго насельніцтва. Такія людзі жывуць пераважна ў горадзе, але сустракаюцца і ў сельскай мясцовасці[1,12]. Многія з іх, хоць і лічаць сябе матэрыялістамі, не пазбаўлены рэлігійнай падсвядомасці, якая грунтуецца на паганскіх забабонах. Так, напрыклад, перакананы атэіст не падае руку або рэч праз парог, абыходзіць месца, дзе перабегла чорная кошка, ці перайшлі дарогу з пустым вядром.

Вілейскі раён эканамічна даволі развіты, што на кожным этапе яго развіцця мела свае негатыўныя адбіткі на захаванні традыцыйнай народнай культуры. «Так пры будаўніцтве Вілейскага вадасховішча было пераселена ў розныя месцы дзевяць вёсак у поўным складзе і чатыры часткова. Пры будаўніцтве завода «Зеніт» у Вілейцы тысячы маладых вяскоўцаў пераехалі ў горад. Некаторыя вёскі, такія як Нарач і Любань, будаваліся як буйныя аграрныя комплексы і засяляліся людзьмі з розных месцаў Беларусі і іншых рэспублік. Гэтыя і многія іншыя прычыны спрыялі хуткім працэсам трансфармацыі і нават знікнення мясцовых культурных традыцый» [5,44].

Калі заглянуць у гісторыю, то можна адзначыць, што хрысціянская вера з першых год свайго існавання паступова меняла ментальнасць беларусаў. Гэта прызнаны факт, але паганскі светапогляд і да нашага часу застаўся характэрным для значнай часткі насельніцтва. Яшчэ на пачатку 16-га стагоддзя паэт–гуманіст Мікола Гусоўскі, характарызуючы духоўны стан і веру нашых продкаў, гаворыць у «Песні пра зубра»: «Часта з трывогаю думаеш: чым растлумачыць /Сілу, што ў нас надаецца замовам і травам, /Песні і магіі слова? Адказу не знойдзеш /І мімаволі згаджаешся: мы яшчэ дзеці /Ў свеце хрышчоных і верым у казкі Медэі. /Варта падумаць над гэтым» [2,76].

Сапраўды варта падумаць, бо і сёння многія, нават хрысціяне, шукаюць бабулек-шаптух, а сваю хваробу звязваюць не з асабістым унутраным станам і вобразам жыцця, а з сурокамі, порчай, прырабленнем. Мала што памянялася з часоў Міколы Гусоўскага, які ў «Песні пра зубра», як бы аналізуючы прычыны такога духоўнага стану землякоў, адзначае: «Дзе недагляд, там сады перарodзяцца ў дзічку, /Поле радзіць перастане, бур’янам заглухне... » [2,76].

Папрок у недаглядзе сваёй паствы аўтар ускосна адносіць да хрысціянскай царквы, ў большасці каталіцкай, бо на гэты час землі сучаснай Беларусі былі ўжо стагоддзе пад уніяй.

Калі мы гаворым пра дзейнасць лекараў, знахараў, варажбітоў, то разумеем, што гэты перажытак паганскага мінулага жыве і ў наш час дзякуючы пасіўнасці царкоўных структур да духоўнага прасвятлення народа. Там, дзе святар самаахвярна нясе служэнне, працуе сярод прыхажан і прыкладам сваёй веры і чысціні жыцця вядзе за сабой прыход, мацнее ніва хрысціянская і сохнуць парасткі язычніцтва. Чалавек своечасова ў царкве атрымлівае адказы на ўсе пытанні свайго жыцця і не мае патрэбы ў знахарах. Тым больш, што царквой ніколі не забаранялася звяртацца да прафесійных дактароў, а таксама тых, хто лечыць травамі без магічнага ўмяшальніцтва.

Пры даследаванні праблемы на Вілейшчыне намі заўважана, што ў населеных пунктах, дзе дзейнічае Царква, лекараў амаль няма і менш тых, хто жадае карыстацца іх паслугамі. У большасці яны ёсць там, дзе не было храма. З гэтага можна зрабіць выснову: развіццё знахарства, лекарства і варажбітства залежыць ад духоўнай адукаванасці насельніцтва, ад яго ўвацаркоўлёнасці.

У вёсцы Ручыца стараста праваслаўнага храма расказаў: У нас строга было. Бацюшка да прычасця не пускаў тых, хто па бабках шукаў сабе здароўя. Хвароба даецца Богам для смірэння і моцы духу. «Каб чалавек панімаў гэта, ды з благадарнасцю прыняў, то і не хварэў бы. Знахары можа і дадуць здароўя, а душу вымуць... » [1,16].

У нашых мясцінах ў асноўным лячылі спуд (пуд), грыжу, здымалі сурокі (порчу, насланнё, нагавор), замаўлялі рожу і ад укуса гадзюкі. Лячылі і жывёлу, у большасці кароў і коней ад сурокаў. Шапталі замовы непасрэдна над чалавекам ці жывёлінай, або завочна на ваду, хлеб, цукар, соль, муку, цукеркі і пячэнне. У рэдкіх выпадках ад прыробленага (начараванага) нагаворвалі на пясок, які трэба было рассыпаць па ўказанні варажбіта[1,17].

Усіх знахараў і лекараў вяскоўцы размяжоўваюць на добрых і нядобрых. Да першых адносяць тых, хто лечыць ад хвароб людзей і жывёлу, да другіх – хто варожыць, прырабляе, адбірае (малако, ураджай і іншае). Менавіта апошнія, па народных павер’ях, знаюцца з нячыстай сілай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У вёсцы Бараўцы жыла жанчына, якая варажыла на картах. Да яе звярталіся жонкі, чые мужыкі на заробкі ездзілі, а яшчэ тыя, хто падазраваў другую палавіну ў нявернасці. Часта такія гаданні прыводзілі да сямейных спрэчак і боек[1,17].

На Вілейшчыне лекараў-шаптуноў ці траўнікаў часцей называлі «бабка», «дзед», «цётка», «дзядзька». Тым больш, што лячылі звычайна людзі сталага ўзросту. Маладыя такой справай не займаліся, бо і давер большы чалавеку ў гадах. Чым старэйшы лекар, тым больш упэўненасці, што ад яго паможацца. Прымалі сакрэты лячэння ў асноўным пасля 30-40 год. А потым яшчэ чакалі сем гадоў, на якія была забарона адкрыта лячыць, абвяшчаць сябе лекарам. Па павер'і лічылася, хто ў першыя сем год пасля навучання пачынаў лячыць, той губляў сілу. Употай можна карыстацца замовамі, шаптаць для самых блізкіх, але каб ніхто пра гэта не ведаў[1,18].

У мясцовай лексіцы сустракаюцца і тэрміны «шаптуха», «лекарка» – «лекар», «знахарка» – «знахар». Такія словы, як «варажбіт», «калдул», «вядзьмар», «чараўнік» сустракаюцца радзей і ў дачыненні да людзей, якія «знаюць на паганае: ўмеюць рабіць, падрабляць, чараваць, варажыць» [1,15]. Калі хто варажыў (гадаў, угадваў наперад), то часцей з выкарыстаннем звычайных картаў. Былі раней і чарнакніжнікі, якія «зналі па кнізе», «чыталі кнігу», «угадвалі па кнізе». Ніхто з апытаных ніколі тых кніг не бачыў, але людзей такіх баяліся, стараліся з імі не звязвацца ніякай справай, абменам, продажам і не сварыцца[1,14]. Як нам расказалі ў адной з вёсак, у Касцяневічах жыў нейкі Аўсянік - чарнакніжнік (пра яго мы неаднойчы чулі). Дык вось ён, па словах жыхаркі вёскі Іжа, «...чытаў па кнізе. У малую комнатку з маленькімі ваконцамі завядзець, а там цёмна. Свечку паліць і ставя стакан вады. Паслухае цябе, у нейкую кнігу загляне і пакажа ў стакане з вадой табе чалавека, які зрабіў. Казалі, і сам ён мог зрабіць. У аднаго чалавека з калод мёд пакралі. Паехаў да Аўсяніка, і той паказаў у стакане, хто злодзей. І кажа, давай зраблю яму, як хочаш. Толькі грэх твой будзе. Пасля той злодзей загінуў..»[1,13]. Праўда гэта было, ці чыстае супадзенне, вызначыць немагчыма.

Статус варажбіта ці знахара часта «прыляпляўся» (і зараз «прыляпляецца») да некаторых людзей зусім нявінных. І гэтыя бедакі нясуць праз жыццё цяжар абвінавачванняў і нічога не могуць выправіць. Так, у вёсцы Суднікі адна жанчынка усё жыццё насіла на сабе кляймо – «благія вочы», хоць, па словах вяскоўцаў, была добрым чалавекам. У вёсцы Сіўцы цэлая сям'я абвінавачвалася ў суроках і ўменні адбіраць малако. У вёсцы Багданава нават у нашы дні на поўным сур'ёзе жанчына расказвае, як з яе агарода ўвесь ураджай пераходзіць на агарод суседні.

Былі выпадкі калі менавіта варажбіты ўказвалі людзям, хто ім «прырабіў», даючы наводку: «высокі, чарнявы», або «баба худая, рыжая», або «сам прыйдзе і папросіць нешта», або «вады нап'ецца». Вярнуўшыся ад варажэя, гаспадар чакаў свайго «ворага», а лепш сказаць ахвяру, якая, нічога не падазраючы, прыходзіла і піла вадзіцу ці прасіла нешта. Без такіх стасункаў не бывае вясковага суседства. Варажбіты добра ведалі пра гэта і, як служкі сілы нядобрай, сеялі варожасць паміж людзьмі. Вось жывы прыклад: «Не вялася скаціна ў адных, дохла. Паехалі да знахара (тут ўзгадваецца той жа касцяневічскі Аўсянік). Указаў на суседку. Прыйдзе, кажа, чаго прасіць – не давайце. Прыехалі дадому, а суседка тут, як тут – прыпёрлася хлеба пазычыць. Яны ні ў якую, дык тая хварасціну з двара папёрла...» [1,19]. Тут адчуваецца доказ віны суседкі, якая на самой справе, магчыма, і ніякага паняцця пра варажбу не мела.

Трапіўшы пад характарыстыкі ці дзеянні, указаныя варажбітом, чалавек станавіўся ворагам таму, дзеля каго, можа, быў найпершым сябрам. Бывала, што і паміж блізкімі родзічамі, і нават роднымі братамі, прабягала чорная кошка. Слухаеш расказы вяскоўцаў з рэальнага жыцця і дзівуешся аддаленасці іх свядомасці ад хрысціянства.

Цяпер у вёсках Вілейскага раёна вельмі мала людзей, якія б умелі лячыць ці штосьці такое б ведалі. Многія носьбіты традыцыі паміраюць, нікому не перадаўшы свой вопыт, бо і тых, хто жадае пераняць, мала, а то і зусім няма. Так у вёсцы Іжа  жанчына паведаміла: «У нас адна баба давала ваду ад спуду – памерла. Было два чалавекі, загаварвалі рожу – паўміралі. Каму памагала, а каму і не. Год з дзесяць таму памер дзядзька, які загаварваў ад гадзіны, ад укуса, на хлеб. Перадаў дачцы, тая яшчэ жыве ў вёсцы Дварэц кіламетраў за пяць ад Іжы. І ў Слабадзе, ад нас 10 кіламетраў, баба загаварвала рожу. Паўміралі, няма нікога» [1,19].

У дачыненні да дзейнасці шаптуноў выкарыстоўваюцца вызначэнні: «замовіць», «загаворыць», «пашэпча», «памоліцца», «нагаворыць», «дасць вадзіцы, хлебца, цукру, солькі», «дасць выпіску (замовіць на цукар ці хлеб) ». За лячэнне платы не ўстанаўлівалі, але «часта бралі, хто што дасць» або «што-небудзь па гаспадарцы памагалі» [1,20].

Пры лячэнні шэптам, бывае, выкарыстоўваюць нож, іголку, ніткі, шыла, нажніцы і іншыя прылады. Так баба з вёскі Сліпкі Рабунскага сельскага Савета рабіла навязкі (вузлы на нітках) для лячэння рожы[1,19], а другая бабка з вёскі Асінаўка Асіпавічскага сельскага Савета «ніткамі здымала суроці», перазязваючы ногі і «перацягваючы вязкі», вылечвала рожу[1,22]. Для лячэння кароў і коней нагаварвала  нават на салідол» [1,24].

Амаль заўсёды і лечаць, і варожаць з выкарыстаннем хрысціянскіх сімвалаў (ікона, крыж, свечка), што робіць дзейнасць знахараў у вачах простага люду прыбліжанай да веры і царкоўнай практыкі.

Цяпер лекараў, знахараў і варажбітоў вельмі мала і на вёсцы яны застаюцца амаль незаўважанымі. Што ж да колішняй вёскі, то роля гэтай сацыяльнай праслойкі была даволі значнай. Асабліва знахары

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і варажэі адмоўна ўплывалі на жыццё вяскоўцаў. Колькі злосці, варожасці, помсты было пасеяна імі сярод людзей. Дзесяцігоддзямі перадавалася з пакалення ў пакаленне непрыязнасць да тых, хто быццам бы «прырабіў». А да катэгорыі прыробленага адносілі любыя няўдачы па гаспадарцы, амаль усе хваробы, няшчасныя выпадкі, смерці і нават смерць па ўзросце.

Тысячу год на нашых землях хрысціянская Царква сее насенне Ісціны, але не ўсякая душа ўспрымае іх. І сапраўды мае рацыю народная пагаворка: «Шмаруй мужыка салам, а ён дзёгцем смярдзіць» [4,146].

**Спіс літаратуры:**


1. Асабісты архіў Іваненкі М.М. / Матэрыялы фальклорна-этнаграфічных экспедыцый па Вілейскім раёне.
2. Гусоўскі, М. Песня пра зубра : Паэма для ст. шк. узросту / укл. В.В. Кушнярэвіч. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 178 с.
3. Минская область : энциклопедия : в 2 т. Т. 1 / редкол. : Л.Ф. Крупец, Г.П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – 512 с. : ил.
4. Фальклор у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў/ НАН Беларусі ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы ; уклад., сістэматызацыя тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай ; уступ. арт. Т.В. Валодзінай ; навук. рэд. А.С. Ліс. – 2-е выд. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 354 с.
5. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў сродкамі народнай педагогікі: (з вопыту работы этнашкол Мінск. вобл.) : вучэб.-метад. дапам. / склад. У.М. Грудінскі, А.С. Вярынская ; УА «Мінскі дзярж. абл. ін-т павышэння кваліфікацыі і перападрыхт. кадраў». – Мінск, 2008. – 245 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ